# Смерць фашысцкай нечысці!

**(Прамова дэпутата Вярхоўнага Совета СССР С. ПРЫТЫЦКАГА)**

Азвярэлыя банды нямецкіх фашыстаў на чале з крывавым Гітлерам акупіравалі і заняволілі рад еўрапейскіх дзяржаў. Сваім паганым ботам яны ўтапталі ў гразь высокую культуру польскага, чэхаславацкага, югаслаўскага і іншых славянскіх народаў, культуру Францыі, Бельгіі, Галандыі і т. д.

Яны аграбілі да апошняй ніткі народы акупіраваных імі краін. Мільёны лепшых сыноў гэтых краін фашысцкія каты расстралялі, замучылі і пасадзілі ў канцлагеры.

Сцягнуўшы велізарныя сілы, узброеныя да зубоў сучаснай тэхнікай, яны ўварваліся ў нашу краіну, часова захапілі Беларусь.

Запылалі і пакрыліся дымам гарады і сёлы Совецкай Беларусі. Ручаямі палілася кроў беларускага народа, застагнала пад акупанскім ботам беларуская зямля.

Народны Камісар Замежных Спраў таварыш Молатаў у сваіх Нотах ярка ахарактарызаваў зверствы нямецкіх людаедаў. Аднак, усё гэта з'яўляецца толькі часцінай таго, што чыняць нямецкія банды над мірным насельніцтвам Беларусі. Іх здзекі над старыкамі, дзецьмі і жанчынамі не маюць падобных прыкладаў у гісторыі, не знаюць ніякіх граніц. І таму помста беларускага народа нямецкім акупантам павінна быць бязлітаснай. Таварыш Сталін сказаў: З гэтага часу наша задача, задача народаў СССР будзе заключацца ў тым, каб знішчыць усіх немцаў да адзінага, якія прабраліся на тэрыторыю нашай радзімы ў якасці яе акупантаў.

І сапраўды. Чаго заслугоўвае бандыт у форме нямецкага салдата, які бярэ за ногі трохгадовае дзіця і разбівае аб печ яго галаву? Чаго заслугоўвае той обер-гад, які гвалціць дзяўчыну, а потым вырэзвае ёй грудзі? Чаго заслугоўвае зграя двуногіх сабак, якія раздзіраюць паміж двух танкаў старыка, які не хача выдаць у рукі катаў комуністаў і вясковы актыў?

Адказам на ўсе гэтыя зверствы можа быць толькі адно — смерць нямецкім акупантам!

Таварышы! Знішчайце заклятага ворага скрозь, дзе толькі яго спаткаеце, дзе толькі зможаце яго злавіць. Знішчайце ўсіх прадажнікаў і правакатараў, як здраднікаў беларускага народа. Няхай нашы пушчы і балоты адгукнуцца моцным рэхам усенароднай помсты нямецкаму акупанту. Няхай кожны прыдарожны роў, кожная тарфяная яма стане магілай для тых, хто адважыўся сваёй паганай нагой таптаць нашу свяшчэнную зямлю. Няхай Нёман і Прыпяць афарбуюцца чорнай фашысцкай крывёю.

Наша доблесная Чырвоная Армія ўжо разбіла дзесяткі і дзесяткі хвалёных нямецкіх дывізій, вымушаючы іх адступаць. Кожны дзень яна вызваляе раён за раёнам, горад за горадам.

Нашай барацьбой кіруе вялікі Сталін. І ў гэтым залог нашай перамогі.

Уперад да канчатковай перамогі над нямецкім фашызмам!